**На мінулым тыдні ў Санкт-Пецярбургу прайшоў І Расійска-беларускі адкрыты студэнцкі агляд-конкурс народнага песеннага мастацтва "Як на рэчцы было на Фантанцы". Арганізатарам мерапрыемства выступіў Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў пры падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, урада Санкт-Пецярбурга, спецыяльнага прадстаўніка Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па міжнародным культурным супрацоўніцтве, міністэрстваў культуры і адукацыі Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь.**

Многае было знакавым ва ўсім гэтым пачынанні: і тое, што праходзіў конкурс у, без перабольшання, гістарычным месцы — у будынках Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта культуры і мастацтваў на Палацавай набярэжнай, якія памятаюць Пушкіна, і тое, што на арганізацыю і падрыхтоўку да гэтага перадусім міжнароднага песеннага форуму спатрэбілася ўсяго паўгода, і тое, урэшце, што конкурс яшчэ толькі абжываўся ў старадаўніх сценах СПбДУКМ, а ніхто з арганізатараў, удзельнікаў і слухачоў ужо не сумняваўся ў яго працягу.

# Яны співаюць — і ты ім верыш...

Чаму не сумняваўся ніхто? Таму што сабраліся ў адным месцы і ў адзін час людзі нераўнадушныя, апантаныя, тыя, хто па-сапраўднаму хварэе за сваю справу і робіць гэтую справу кожны ў сябе на радзіме. А вось па страчаных за апошнія два дзесяцігоддзі творчых кантактах, стажыроўках ды тусоўках паспелі ўжо і засумаваць: сабраліся і адразу зразумелі, што цяпер будуць сустракацца і далей. Каб зноў не страціць, не разгубіць...

Ёсць нешта просценькае ды мілае ў назве конкурсу, падказанай словамі са страдаўняга рускага раманса "Як на рэчцы было на Фантанцы".

Ёсць нешта строгае і сур'ёзнае ў структуры конкурсных намінацый, якіх толькі дзве: "Фальклорныя спевы" (ансамблі і салісты) і "Народна-стылізаваныя спевы" (ансамблі і салісты).

Ёсць прадуманасць і лагічнасць у складзе ўдзельнікаў: навучэнцы і калектывы прафесійных устаноў культуры і мастацтваў сярэдняй і вышэйшай адукацыі. Усяго конкурс сабраў каля 200 юных і маладых артыстаў з розных рэгіёнаў Расіі і Беларусі. З расійскага боку гэта прадстаўнікі Астраханскага каледжа культуры, Валагодскага музычнага каледжа, Пскоўскага абласнога каледжа мастацтваў імя М.А.Рымскага-Корсакава і Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. З беларускага боку — навучэнцы і студэнты Баранавіцкага дзяржаўнага музычнага каледжа, Брэсцкага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Р.Р.Шырмы, Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.Глінкі, Наваполацкага дзяржаўнага музычнага каледжа, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Ёсць моцны склад журы на чале з народным артыстам Расійскай Федэрацыі, прафесарам, загадчыкам кафедры опернай падрыхтоўкі Санкт-Пецярбургскай дзяржаўнай кансерваторыі (акадэміі) імя М.А.Рымскага-Корсакава Юрыем Канстанцінавічам Лапцевым.

Зноў жа неаднаразова кажу гэтае "ёсць" у дачыненні да конкурсу, які ўжо адбыўся, бо і сам не сумняваюся, што ён будзе мець працяг. А пераканацца ў гэтым дазволіла ўбачанае і пачутае на гала-канцэрце ў Малой зале Санкт-Пецярбургскай акадэмічнай філармоніі імя Д.Д.Шастаковіча, а таксама на круглым стале па тэме "Вывучэнне, захаванне і развіццё культуры ў Саюзнай дзяржаве: вопыт арганізацыі і правядзення масавых культурных мерапрыемстваў студэнцкай моладзі".

Рэктар СПбДУКМ Аляксандр Сяргеевіч Тургаеў, які, уласна кажучы, на правах гаспадара і вёў круглы стол, адразу заўважыў, што агляд-конкурс "Як на рэчцы было на Фантанцы" — гэта, з аднаго боку, планавае міжнароднае мерапрыемства, а з другога — планаваць трэба было ўсё, бадай, з белага аркуша. "Цяпер, калі першы крок зроблены, будаваць планы на будучыню ўжо лягчэй. Дзякуй богу, нам удалося арганізаваць дзве прынцыповыя рэчы — кантактаванне і спаборніцтва. Гэта менавіта тое, што трэба моладзі. Але далей нам трэба будзе не проста прыязджаць (ці беларусам да нас, ці нам да беларусаў), а ўжо і вучыцца адно ў аднаго, магчыма, нават каардынаваць вучэбныя планы профільных устаноў культуры і мастацтва ў дзвюх краінах. Ва ўсякім разе першы крок зроблены, і з гэтай нагоды мне ўспамінаюцца словы жонкі знакамітага Аркадзя Райкіна, якая гаварыла: "Заходзь — значыць не прыходзь. А прыходзь — значыць прыходзь у чатыры гадзіны, будзем есці пірог з капустай". Дык вось наша мерапрыемства — з шэрагу "прыходзь-мерапрыемстваў", — адзначыў А.С.Тургаеў.



Намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Т.Э.Казачонак і рэктар Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў А.С.Тургаеў. Падчас перадачы падарункаў ад беларускага міністэрства.

Так было знойдзена на круглым стале першае ключавое слова конкурсу — "прыходзь".

Другое і трэцяе ключавыя словы агучыў прарэктар СПбДУКМ па агульных пытаннях і развіцці Юрый Іванавіч Бундзін, калі загаварыў пра мультыплікатыўныя мэты конкурсу і інавацыйнасць праекта. Мультыплікатыўнасць у тым, што конкурс "Як на рэчцы было на Фантанцы" не проста канцэртная праграма, а найперш канцэртна-выканальніцкая "вытворчая" практыка, па сутнасці, ранняя прафесіяналізацыя канкурсантаў. Дзеля гэтага ў праграму мерапрыемства быў уключаны цэлы шэраг майстар-класаў вядучых выкладчыкаў кафедры рускага народнага песеннага мастацтва СПбДУКМ ("Асваенне лакальных спеўных традыцый у класе фальклорнага ансамбля", "Методыка навучання расшыфроўцы народных песень", "Асваенне дыялектных спеваў у класе фальклорнага ансамбля" і інш.). Адсюль і інавацыйнасць — укараненне лепшых навукова-метадычных дасягненняў у практыку.

З грунтоўным паведамленнем на круглым стале выступіла начальнік аддзела ўстаноў адукацыі і работы з творчай моладдзю Міністэрства культуры Беларусі Алена Рыгораўна Гуляева, якая таксама называла "свае" ключавыя словы і выразы, у прыватнасці "традыцыйная культура". Алена Рыгораўна падкрэсліла, што менавіта традыцыйнай культуры ўдзяляецца ў нашай краіне вельмі вялікая ўвага. Напрыклад, у Дзяржпраграме "Культура Беларусі", разлічанай да 2015 года, адна трэць заданняў разлічана і сарыентавана на вывучэнне і разгляд пытанняў, звязаных менавіта з традыцыйнай культурай. Або яшчэ адзін факт: Міністэрства культуры летам 2012 года правяло спецыяльную калегію, на якой былі разгледжаны пытанні развіцця, захавання і вывучэння традыцыйнай культуры. "Гэта быў знакавы момант як у развіцці культуры, так і ў дзейнасці самога міністэрства, паколькі ўпершыню мы ўбачылі ўсё тое, што звязана з традыцыйнай культурай, у комплексе. Гэта ж не толькі дзейнасць устаноў адукацыі, але і вельмі глыбокая навуковая прапрацоўка многіх сур'ёзных пытанняў, у тым ліку пытання забеспячэння пераемнасці культурнага развіцця. Гэта вельмі важны момант, паколькі ў першую чаргу звязаны з самазахаваннем нацыі, з разуменнем таго, хто мы такія ёсць, адкуль мы ўзніклі і ў якім кірунку будзем рухацца далей", — адзначыла выступоўца.

Думаецца, расійскім калегам было цікава паслухаць і наступныя факты ды лічбы. З 2011 года пасля ўступлення ў сілу Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ў нас паявіліся новыя кірункі дзейнасці дзіцячых школ мастацтваў, у прыватнасці народная творчасць. Гэта значыць, што будучыя прафесіяналы і спецыялісты ў названай галіне сістэмна і мэтанакіравана рыхтуюцца ўжо з вельмі ранняга ўзросту. У Беларусі сёння дзейнічае мноства фальклорных калектываў, у якіх займаюцца 32 тысячы дзяцей. Прычым істотнае значэнне мае той факт, што большая частка з гэтых калектываў рэалізуюць сваю дзейнасць за кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў і ўсяго 0,3 працэнта дзейнічаюць на платнай пазабюджэтнай аснове. Наогул, у дзіцячых школах мастацтваў сёння вучыцца 109 тысяч дзяцей. "Але ці ўсе яны паступаюць ва ўстановы культуры і мастацтва сярэдняй адукацыі? Што тычыцца традыцыйнай культуры, то ці заўсёды мы можам супаставіць яе з прадметнай арганізацыяй адукацыйнага працэсу? Ці заўсёды можам расчляніць усё, што адбываецца ў сферы традыцыйнай культуры, на асобныя прадметы? Можа, больш прадуктыўным было б аб'ядноўваць усё вакол аднаго стрыжня — абраду?" — агучыўшы гэтыя рытарычныя пытанні, А.Р.Гуляева паведаміла, што з новага навучальнага года ў дзіцячых школах мастацтваў Беларусі пачнецца апрабаванне новых эксперыментальных праектаў.

Намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Таццяна Эдуардаўна Казачонак прывяла прыклады паспяховых праектаў у галіне адукацыі і выхавання, якія ажыццяўляюцца ў рамках супрацоўніцтва нашай краіны і Расіі ў рамках Саюзнай дзяржавы. А гэта і алімпіяды школьнікаў "Расія і Беларусь: гістарычная і духоўная еднасць", і сумесныя расійска-беларускія велапрабегі, і многае іншае. "Я невыпадкова гавару пра выхаваўчыя і адукацыйныя мерапрыемствы на культурным форуме. Бо, гаворачы пра культуру, мы адначасова думаем пра грамадзянскае выхаванне. Усё-такі і ў сферы адукацыі, і ў галіне культуры перад намі стаяць, па сутнасці, агульныя задачы — выхаваць культурных і адукаваных людзей, а значыць, сапраўдных грамадзян, патрыётаў сваёй краіны. Мы хочам, каб наша будучае пакаленне любіла сваю родную краіну, хацела жыць у ёй і менавіта на радзіме дасягаць поспехаў", — падкрэсліла Таццяна Эдуардаўна.

Яна ж выступіла з шэрагам канкрэтных прапаноў па супрацоўніцтве з расійскімі калегамі, у прыватнасці, запрасіла пецярбуржцаў далучыцца да "Зорных паходаў", якія ладзіць Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка. Ужо вядома, што з 2013 года да гэтага праекта далучацца масквічы, а ў 2014 годзе, калі "Зорным паходам" споўніцца роўна 50 гадоў, кагорту руплівцаў па шанаванні традыцый і гісторыі маглі б папоўніць і студэнты ды выкладчыкі з Санкт-Пецярбурга, тым больш што "Зорныя паходы" не абыходзяцца без фальклорных экспедыцый — у кантэксце размовы пра традыцыйную культуру гэты момант набывае прынцыповае значэнне. Невыпадкова прарэктар СПбДУКМ Ю.І.Бундзін адразу ж "ухапіўся" за ідэю далучыцца да "паходаў" разам з беларусамі.

Зрэшты, і з вуснаў іншых выступоўцаў гучала яшчэ нямала цікавых прапаноў на перспектыву. Згадваўся міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску": а чаму б не арганізаваць гэтакі малы "Славянскі базар", сарыентаваны выключна на студэнцкія калектывы і студэнтаў-выканаўцаў? Згадваўся зводны сімфанічны маладзёжны аркестр у складзе адораных навучэнцаў Расіі і Беларусі: а чаму б не стварыць зводны расійска-беларускі хор народнай песні? Пры ўсёй утапічнасці некаторых "праджэктаў" было адчуванне, што нешта ўсё-такі абавязкова будзе. Прычым у вельмі недалёкай будучыні. Хутчэй за ўсё, гэтае "нешта" будзе ўяўляць сабой гастрольны тур студэнцкіх беларускіх і расійскіх калектываў і салістаў, удзельнікаў агляду-конкурсу "Як на рэчцы на Фантанцы" па малых ды вялікіх гарадах па маршруце Санкт-Пецярбург — Мінск — Брэст.

А падчас і пасля цудоўнага гала-канцэрта і цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў агляду-конкурсу прамаўляліся ўсё новыя і новыя ключавыя словы на сцэне і ў кулуарах: "Яны співаюць — і ты ім верыш...", "Галоўнае, што мы помнім і любім адно аднаго", "Мы адчулі дыханне самога часу, калі гучалі лепшыя ўзоры народна-песеннага мастацтва", "Самае важнае, што прадэманстраваў конкурс, — нас нікому не разлучыць".

Якая розніца, хто казаў адно, хто — другое, хто — трэцяе? Якая розніца, хто гэта быў: беларус ці расіянін, прадстаўнік арганізатараў ці журы? Якая розніца, хто ўзяў гран-пры конкурсу і хто — спецыяльныя прызы?

Усё ж толькі пачынаецца з Фантанкі.

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*
Мінск — Санкт-Пецярбург — Мінск.

**P.S.** *Для тых, каму ўсё-такі гэта важна пачуць, называем некаторых пераможцаў. Гран-пры І Расійска-беларускага адкрытага студэнцкага агляду-конкурсу народнага песеннага мастацтва "Як на рэчцы было на Фантанцы" ўзяў зводны хор Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Пераможцамі сярод ансамбляў у намінацыі "Народна-стылізаваныя спевы" сталі ансамбль народнай песні Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.І.Глінкі і ансамбль народнай песні "Валачобнікі" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а ў намінацыі "Фальклорныя спевы" — ансамбль "Крыніца" Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і ансамбль студэнтаў і педагогаў Валагодскага музычнага каледжа. Сярод салістаў у намінацыі "Народна-стылізаваныя спевы" перамаглі Вераніка Курбанмамадава (СПбДУКМ) і Эльвіра Стальмашук (Мінскі дзяржаўны музычны каледж імя М.І.Глінкі), а ў намінацыі "Фальклорныя спевы" — Кацярына Ляпіна (СПбДУКМ) і Аліна Кныш (Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў). Спецыяльны прыз ад Міністэрства культуры Беларусі быў уручаны кафедры рускага народнага песеннага мастацтва СПбДУКМ у гонар 40-годдзя яе заснавання. Спецыяльным прызам рэктара СПбДУКМ узнагароджаны ансамбль народнай песні "Дзівосы" Баранавіцкага дзяржаўнага музычнага каледжа.*

ISSN 1994-9146
9 771994 914000 12155

Галоўны рэдактар Вадзім Кнышаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ